# Хто сапраўдны арганізатар, а хто кіруе плынню нелегальнай міграцыі?

**Плынь уцекачоў праз Беларусь у Еўразвяз не спыняецца. Літва лічыць, што гэта помста Лукашэнкі ў адказ на санкцыі Бруселю – Менск сваю віну адмаўляе. Але 15 ліпеня Ірак заявіў, што пачынае расследаванне магчымай злачыннай сеткі, арганізаванай рэжымам Лукашэнкі.**

Хто сапраўдны арганізатар, а хто кіруе плынню нелегальнай міграцыі? У чыіх руках жывыя людзі сталі зброяй, а ў чыіх – таварам? Колькі ў гэтым годзе зарабілі кантрабандысты, якія перапраўляюць бежанцаў праз нашую краіну? А колькі на гэтым зарабілі ўлады Беларусі? На ўсе гэтыя пытанні мы шукалі адказы разам з літоўскім інтэрнэт-выданнем 15min.lt і Альянсам незалежных расследавальнікаў Беларусі.



## АФРЫКАНСКІЯ ЖАРСЦІ

19 ліпеня 2021 года. Здымачная група «Давайце разбірацца» выязджае да беларуска-літоўскага памежжа, каб вывучыць сітуацыю. Мясцовыя жыхары распавялі: наплыў замежнікаў з далёкага поўдня ў вёсцы назіраецца з пачатку лета. А на наступны дзень, а 6-й гадзіне раніцы, калі журналісты выязджалі назад, знянацку з ляснога гушчару на дарогу выйшаў чалавек неславянскай аблічнасці:

«Я паехаў з Конакры ў Стамбул. Купіў білет на самалёт да Беларусі, бо мне сказалі, што там з Літвою агульная мяжа. Потым я ўжо зразумеў, што гэта не так – і на самой справе небяспечна. Тэрмін маёй візы ўжо заканчваўся, і ў мяне не было часу на зборы… і грошай, каб падоўжыць візу. Таму я пакінуў рэчы ў гатэлі і ўзяў толькі самае неабходнае. Ужо на мяжы я зразумеў, што забыўся пашпарт. Але вярнуцца я не мог», – апавёў уцякач з Конакры – Бары Альфа.

Малады чалавек трапіў у Беларусь са С’ера-Леонэ, што ў Заходняй Афрыцы. За шлях з радзімы і да беларуска-літоўскага памежжа заплаціў € 2500.




«У нас дрэнныя ўмовы, напрыклад, электрычнасць – нідзе няма святла. Таму я і збег з краіны. Я выходзіў на вуліцы і казаў пра тое, што наш урад нічога не робіць. І яны вырашылі мяне схапіць, але я ўцёк. Мой тата памёр у сувязі з палітычнай сітуацыяй у краіне. Я схаваўся ў Гвінеі – у Конакры, і правёў там шмат гадоў – успамінае афрыканец».

Ён прыляцеў у Менск праз Стамбул, засяліўся ў сталічны гостэл. Пакінуў там пашпарт. Да памежжа наш выпадковы знаёмы даехаў на маршрутцы з такімі самымі, так бы мовіць, «вандроўнікамі». Але праваднік кінуў маладога чалавека ў лесе, сцвярджае Бары Альфа:

«Ён узяў мае грошы і сказаў, што мы сустрэнемся каля мяжы. Гэты чалавек высадзіў мяне і паабяцаў, што будзе чакаць на тым баку. Але ў выніку проста кінуў мяне і з’ехаў. Я яго бачыў упершыню і не ведаю, хто гэта. Ён сказаў, што проста робіць сваю працу. Ён жыве ў Беларусі».

Шлях у Еўропу праз Беларусь афрыканцу падказаў сябар:

«Я на той момант быў у Конакры, працаваў, каб адкласці грошы. Мне нават прыйшлося папрасіць майго дзядзьку пазычыць мне. І гэтыя грошы я аддаў, каб атрымаць запрашэнне на працу футбалістам у Беларусі, паводле якога мне зрабілі візу. Раней я вельмі добра гуляў у футбол. Хачу з’ехаць у нармальную краіну ў Еўропе, я не хачу жыць у Афрыцы».

Пры гэтым уцякач паказвае нам паперу беларускай прыватнай установы «Футбольны клуб «Акадэмік», на падставе якой прыляцеў у Беларусь. Арфаграфію і пунктуацыю мы захавалі.




Установа «Футбольны клуб «Акадэмік» працуе з 2016 года, дырэктар і ўласнік – Андрэй Сямцоў.




Частное спорти...

«Футбольный клуб
«Академик»

223035, Республика Беларусь, Минск, ул. Крупской, дом 21, офис 8 УНП 192681894, ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, ул. Сурганова, 43-47, код 270, ОКПО 37526626
Р/с BY48ALFA30152151980080270000

Barrie Alpha

№300 от 14.07.2021

Приглашение

Настоящим приглашением сообщаем, что мы готовы принять вас для участия в тренировочных сборах и презентации ваших личных спортивных качеств, которые пройдут в период с 15.07.2021 по 10.08.2021 в г.Минск, Республика Беларусь.

Мы предоставляем полный комплекс услуг для проведения сборов и презентации личных качеств, включая направление на профессиональный медицинский осмотр.

Директор Семцов А.В.

Мы патэлефанавалі, каб ён патлумачыў, на якой падставе друкуюцца запрашэнні для мігрантаў, аднак ягоны тэлефон працуе ў рэжыме галасавой пошты.

## МІГРАНТЫ НА ЭКСПАРТ

З канца вясны Літву наваднілі нелегальныя мігранты з Беларусі. Амаль штодзень мяжу пераходзяць сотні чалавек: іракцы, сірыйцы, выхадцы з Афрыкі. Гэта ў 25 разоў больш, чым за ўвесь мінулы год.




Міграцыйны крызіс у Літве супаў з турыстычным бумам у Менску, цікавасць да якога выказалі ўсё тыя ж іракцы.

І калі ў мінулым годзе Беларусь наведала 5000 іракцаў, то сёлета параўнальная колькасць прыехала за адзін толькі чэрвень – прыкладна 4000 турыстаў з гэтай краіны.



А ў ліпені, заўважылі журналісты, з Багдаду пачаў лётаць двухпалубны «Боінг 747». На ім толькі за адзін рэйс могуць прыляцець 660 пасажыраў, ці 2640 за тыдзень замест ранейшай тысячы.




І пры мінімальных падліках за два летнія месяцы ў краіну трапіла больш іракцаў, чым за ўвесь мінулы год. Прычынаў для скарачэння гэтай плыні пакуль не бачна, упэўнены Відмантас Балкунас, журналіст выдання 15min.lt:

«Самы пачатак паездкі заўсёды падобны: гэта турыстычныя візы ў Менск. Людзі прылятаюць легальна. І тады яны ўжо могуць або выкарыстоўваць паслугі кантрабандыстаў, або самі спрабаваць дабірацца».

У аэрапорце рэйсы з Багдаду рэгулярна сустракаюць. Мы заўважылі, што сярод тых, хто там чакае, назіраецца пэўная іерархія. Самыя галоўныя – некалькі мужчынаў, яны даволі проста адзетыя, але ў іх дарагія гадзіннікі і тэлефоны. Яны час ад часу падыходзяць да сваіх падначаленых і выдаюць кароткія ўказанні.

Сярод тых, хто непасрэдна сустракае, шмат дзяўчат. У кожнага – спісы з прозвішчамі. Самалёт прыляцеў, і іракцаў па 1–2, максімум па 3 чалавекі выводзяць на вуліцу. Пад’язджаюць машыны, якія развозяць турыстаў па гатэлях. Мы тройчы прыязджалі ў аэрапорт, і заўсёды карціна была прыкладна аднолькавая: цэнтралізавана вялікіх групаў турыстаў у аэрапорце не сустракалі і на турыстычным аўтобусе ў Менск не вазілі.

Пры гэтым кіраўнік Беларусі ведае пра надзвычайнае становішча на літоўскай мяжы, аднак неаднаразова падкрэсліваў: яго стаўленне да праблемы – адказ на санкцыі Бруселю.

І пакуль Лукашэнка спрабуе выгандляваць сабе эканамічныя паслабленні, у інтэрнэце поўнаю хадою гандлююць квіткамі ў лепшае жыццё.

Акрамя таго, на «YouTube» і ў сацсетках арабы выкладаюць ролікі, у якіх даюць інструкцыі для пераходу беларуска-літоўскай мяжы і парады, як трапіць у Еўропу, мінаючы памежнікаў.

Ахмэдаль Бадыры перачытаў масу такіх інструкцыяў, ён плануе неўзабаве выехаць з Іраку і трапіць у Еўропу праз Беларусь. Аднойчы ён ужо ўцякаў праз Беларусь у Фінляндыю, але яго вярнулі ў Багдад:

«Гэта просты спосаб трапіць у Еўропу. Мы хочам жыць спакойна, каб дзеці атрымалі адукацыю. Той, хто ўжо з’ехаў, дзеліцца кантактамі правераных кантрабандыстаў, і ў кожнага свае спосабы. Яны бяруць грошы наяўнымі, толькі еўрамі, ніякіх пераводаў праз банк».







Мужчына адзначае лаяльнае стаўленне беларускіх памежнікаў да людзей, якія бягуць у Еўропу:

«Яны проста заплюшчваюць вочы і даюць нам прайсці. Можа, у іх загад ад прэзідэнта ці яшчэ што. Яны бачаць, як людзі мінаюць мяжу вось такім чынам, але нікога не арыштоўваюць».

Праз Беларусь у Еўропу трапіць і хутчэй і танней, адзначаюць інсайдары. Але плаціць прыйдзецца на кожным этапе, а шлях у лепшае жыццё выглядае наступным чынам. Чалавек атрымлівае візу, набывае квіткі на самалёт. Гэта, са словаў крыніцаў, каштуе каля € 600, потым гатэль ≈ € 250, далей – плата за падвоз да памежжа ад € 200 і паслугі праваднік.




Калі атрымаецца перайсці незаўважаным – трансфер з Літвы ў Германію, і гэта ад € 1000 да € 2000.




Агулам нелегальны выезд каштуе ад € 5000 з разлікам наяўнымі ў кожным пункце. Можна замовіць пакет – гэта каля € 15 000. Калі выязджаць цалкам самастойна, то можна ўкласціся ў € 2500.

«Калі рабіць праз кантрабандыстаў, то ўсё пройдзе добра. Пераважна ўсім удавалася без праблемаў праехаць. Але калі рабіць самастойную спробу, то цябе зловяць», тлумачыць Ахмэдаль Бадыры.

Як высветлілася, у Іраку перапраўкай уцекачоў займаюцца некаторыя турыстычныя кампаніі. Ёсць і тыя, хто хутка, але па нізкіх коштах набудзе нерухомасць ці бізнес чалавека, які захацеў падацца ў

Еўропу. Агулам з Беларусі на час рыхтавання матэрыялу ў Літву трапілі 2228 мігрантаў, а ў Польшчу – каля 300. Калі падлічыць прыбыткі кантрабандыстаў паводле сярэдніх коштаў на іхныя паслугі за транзіт у Еўропу – € 8500 за чалавека, то з пачатку года, выкарыстоўваючы Беларусь, яны зарабілі ≈ € 21 500 000.




## БЕЛАРУСКІ КАЛІДОР

А як жа на ўсім гэтым зарабляе беларуская дзяржава? Па-першае – за кошт вакцынацыі ад каронавіруса – прышчэпкі ўлучаюць у турыстычны пакет. Нягледзячы на трэцюю хвалю каронавіруса і выяўлены індыйскі штам, з 1 ліпеня Аляксандр Лукашэнка ўвёў бязвізавы рэжым для грамадзянаў 73 краінаў, якія прыедуць на прышчэпку ад ковіду на пяць дзён і якім не трэба сядзець на каранціне.



Пры гэтым прышчэпка «Спутнік», якую замежнікам прапаноўваюць улады Беларусі, не прызнаная ў Еўропе. Па-другое – уласна турыстычныя паслугі. Міністр замежных справаў Літвы Габрыелюс Ландсбергіс заявіў, што ў Беларусі да перапраўкі ўцекачоў мае дачыненне дзяржаўная турфірма «Цэнтркурорт», якая належыць Кіраўніцтву справамі прэзідэнта. Ну, і па-трэцяе, спосаб заробку на мігрантах для Менску – гэта нефармальны падатак на незаконны выезд у Еўразвяз. За 1000 іракцаў, якія трапіліся літоўскім памежнікам, улады Беларусі атрымалі $ 2 000 000. І гэта без уліку тых, хто прайшоў незаўважаным. Рэч у тым, што ў кампаніі «Цэнтркурорт» – дамова з Іракам. Кожны турыст пакідае турфірме ад $ 3000 да $ 4000 і ў выпадку невяртання на радзіму – грошы ў якасці штрафу адыходзяць беларускаму боку.

Калі бежанец пройдзе мяжу незаўважаным, на літоўскім баку яго сустрэне ўжо іншы таксіст. Нашыя літоўскія калегі пад выглядам уцекачоў выклікалі такую машыну.

Відмантас Балкунас, журналіст 15min.lt:

«Мы гаварылі з многімі людзьмі, якія ўжо праходзілі, якія плануюць. Мы ўкараніліся ў групах нелегальных мігрантаў, дзе яны пытаюцца пра цэны, пра кантакты. Мы самі тэлефанавалі кантрабандыстам, мы самі выклікалі сабе таксі. Таксі ад мяжы, ужо калі яны пяройдуць, трапляць у Літву, да Германіі каштуе € 400–1300».

Таксама мы знайшлі і таго, хто на тэрыторыі Беларусі займаецца падвозам нелегалаў і пацікавіліся, як ідзе бізнес і ці магчыма так падзарабіць любому жадаючаму толькі пры наяўнасці аўтамабіля.




15 ліпеня кіраўнік МЗС Іраку Фуад Хусэйн падтрымаў ідэю правесці расследаванне незаконнага транспартавання іракскіх мігрантаў у Літву праз Беларусь.

А што наконт гэтага думае кіраўнік беларускага МЗС Уладзімір Макей?

Літоўскія памежнікі кажуць, што незаўважанымі ў Еўропу трапляюць 30 % мігрантаў. Імкнучыся да лепшага жыцця, большасць з іх трапляе пад пагрозу дэпартацыі. 22-гадовы Ахмэд з Емену ехаў у Еўропу праз Беларусь і перайшоў мяжу ў лесе. Ён сам здаўся літоўскім памежнікам і трапіў у лагер, распавёў мужчына:

«Я ішоў дзесьці 4 гадзіны, можа, кіламетраў 15. Я не памятаю. Але было холадна. Яны нас знайшлі дзесьці аб 11-й вечара. Усё нашае адзенне да таго моманту было наскрозь мокрае. І вось так мы ноччу, мокрыя і халодныя, чакалі 9 гадзінаў, пакуль яны пастановяць, што з намі рабіць. Адправіць нас у прытулак ці што. Потым мы сядзелі ў турме тры дні. Нам зрабілі тэст на ковід і пасадзілі на 14







дзён на каранцін. Пасля каранціну нас адвезлі для адбіткаў у іміграцыйны офіс і на размову. Ахова ў лагеры не вельмі добразычлівая. Крычаць на цябе і абыходзяцца, як з рабамі. Быццам мы сабакі нейкія. Мы цяпер усім знаёмым гаворым, каб не ехалі праз Літву. Бо калі трапіце там у лагер для ўцекачоў, вам прыйдзецца нясоладка. Да таго, як мы прыехалі ў Галандыю, мы нейкі час правялі ў Польшчы. Там нас злавілі і пасадзілі ў турму на 20 дзён. У нас нават не было магчымасці памыцца за ўсе гэтыя дні».

На таксі хлопец даехаў з Польшчы ў Нідэрланды, дзе цяпер і застаецца. І пакуль ён уладкоўваецца ў новай краіне, да беларуска-літоўскага памежжа з усяго свету з’язджаюцца тыя, хто шукае лепшага жыцця. У іх бяруць немалыя грошы, іх падманваюць і пакідаюць у лесе. Іх выкарыстоўваюць як зброю і гандлююцца імі – жывымі людзьмі.